©ГДУ

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ФІЛАСОФСКАЯ ЛІРЫКА: АСНОЎНЫЯ ВЕКТАРЫ РАЗВІЦЦЯ

***А. А. БАРАНОЎСКІ*, А. В. БРАДЗІХІНА**

The concept of theoretical understanding and the concept of «philosophical poetry» and its typology are interpreted in this work, it is proved that this distinctive artistic phenomenon is a subject to the modifications of each stage of the historical and cultural development, identifies the main vectors of the art search in modern Belarusian lyrics and specificity of implementation it ontological, cosmological and epistemological issues; the main trends of formal exploration of contemporary poets are shown : philosophers, particularly the subjective object of this type of organization of the lyrics, the embodiment of space-time continuum, experiments in rhythm and metrical and compositional structure

Ключавыя словы: філасофская лірыка, медытатыўная лірыка, навуковая паэзія, вітальна-танатычныя матывы, гнасеалагічныя матывы, Хаос і Космас, хранатоп, лірычны герой, верлібр

Філасофская лірыка (або «паэзія думкі»), нягледзячы на «вечнасць» пытанняў, якія выступаюць аб'ектам яе мастацкага разгляду, на кожным этапе гісторыка-культурнага развіцця мае сваё непаўторнае аблічча, а сам гэты тэрмін набывае адметнае напаўненне. У сённяшняй філалагічнай навуцы пад паняццем «паэзія думкі» разумеюць від лірыкі, які мае выразную блізкасць з філасофіяй у прадмеце спазнання, характарызуецца цеснай знітаванасцю рацыянальна-дыскурсіўнага і эмацыйна-пачуццёвага пачаткаў і выяўляецца ў трох мадыфікацыях – уласна філасофскай паэзіі, навуковай і медытатыўнай. Апошняя з’яўляецца дамінантнай у айчынным вербальным мастацтве на працягу ўсёй гісторыі яго развіцця.

У сучаснай беларускай паэзіі цэнтр раўнавагі ў пазнанні свету пасунуўся ў накірунку ад пачуццяў да роздуму. Аўтары лірычных тэкстаў усё часцей разважаюць над першавытокамі з’яў рэчаіснасці, адметнасцямі чалавечай свядомасці, вынікамі людскіх учынкаў у прагнастычным аспекце.

Так, шматсэнсоўнасць лірыкі У. Арлова ў многім абумоўлена поліантычнасцю яго мастацкай рэальнасці. Пры наяўнасці сродкаў-медыумаў (люстэрка, студні і інш.) паміж адрознымі светамі ў творчасці паэта законы фізікі пачынаюць падпарадкоўвацца лірычнаму герою: «Усё часцей сустракаю людзей, / што памерлі раней за маё нараджэнне» [1, с. 71]. Для падобнай канцэпцыі характэрна абсалютызацыя якаснай своеасаблівасці жывога, адмаўленне ролі хімічных і фізічных заканамернасцей у ім, матэрыялістычнага тлумачэння з'яў жыцця. Верш у такім выпадку знешне максімальна набліжаецца да прозы, не губляючы, аднак, унутранай паэтычнасці.

Патлумачыць сутнасць жыццёвых з’яў, працэсаў і нават паводзін людзей у тым ці іншым вымярэнні паэт імкнецца пры дапамозе нематэрыяльнага пачатку («энтэлехіі»), асноўнай якасцю якога выступае жыццесцвярджальнасць. Па-філасофску ўспрымаючы хуткаплыннасць і канечнасць фізічнага зямнога існавання, лірычны герой У. Арлова верыць, што душа працягвае свой шлях і надалей: «гэты жніўеньскі дзень / прысніцца мне / пасля смерці» [1, с. 100].

Характэрнай рысай вітальнай канцэпцыі А. Разанава выступае вера ва ўсемагутнасць чалавека. Лірычны герой не толькі з’яўляецца сукупнасцю шмалікіх вобразаў, з’яднаных у адзін, а і сам можа выступаць дэміургам, ствараючы новыя рэальнасці. Усёмагутнасць чалавека, на думку паэта, звязана з яго творчымі магчымасцямі, воляй і розумам, сам ён пры гэтым не проста частка рэальнасці, а асобны сусвет: «І мы, здзіўляючыся, разумеем, / Што мы гэтаксама зямля, / У якой схаваныя нейчыя скарбы» [2, с. 346].

У аснову светапогляду лірычнага героя інтымна-філасофскіх рэфлексій Л. Дранько-Майсюка пакладзены геданізм. Гэта не азначае, тым не менш, што паўнавартаснасць жыцця суадносіцца толькі з фізічнай асалодай. Немалаважнай у аксіялагічнай сістэме героя (аўтара) з’яўляецца і наяўнасць душы: «Здаецца нічога не будзе / З таго, што ў пясок адышло, – / Хіба што душа ў перапудзе / Хоць нейкае знойдзе святло» [3, с. 74].

Адной з магістральных ідэй творчасці сучасных беларускіх паэтаў-філосафаў з'яўляецца проціпастаўленне Хаосу і Космасу. Космас імкнецца да гармоніі, Хаос яе парушае. Аднак узнікненне першага зусім не азначае поўнае знікненне апошняга. Так, Валянціна Аксак з накіраванасцю яе мастацкага пошуку да вечнага, рэлігійнага, метафізічнага (зб. «Цвінтар», «Капліца»), асноўнымі арыенцірамі сваёй творчасці абрала катэгорыі Хаос і Космас, дзве процілеглыя канцавосі ў архетыпічнай свядомасці. Значэнне парадку, цэласнасці, спакою часта атаясамліваецца ў аўтаркі з верай: «<…> спелым яблыкам позняга лета / ў каляі маё згасне святло, / дай, Гасподзь, мне зямельку сагрэту / босых ножак унука цяплом» [4, с. 67]. Хаос у лірыцы В. Аксак, у сваю чаргу, успрымаецца як праява матэрыяльнага існавання, раз’яднанне духоўнага і фізічнага, нябеснага і зямнога пачаткаў, атаясамліваючыся з маральнай дэградацыяй грамадства: «Хворы храм. / Застудзіліся грудзі ў амбона, / <…> Словы споведзі пройма адносіць і гром…» [4, с. 20].

Космас у мастацкай сістэме Яна Чыквіна – самаарганізацыя і ўвасабленне сусветнага неспакою, філасофскае разуменне непазбежнага скону. «Хопіць смерці ўсім” [5, с. 189], – спакойна канстатуе лірычны герой. Яго нястрымна вабіць да зліцця, растварэння з прыродай, з сусветным касмічным рухам: «І я калісьці быў / супольнікам сям’і буйна-зялёных» [5, с. 196]. Менавіта ў гэтым яднанні з Космасам паэт бачыць магчымасць і надзею дасягнуць згубленага шчасця і спазнання самога сябе: «І хтосьці даў мне разуменне сябе і свету» [5, с. 197].

Заўважнае месца ў сучаснай беларускай філасофскай лірыцы займаюць гнасеалагічныя матывы. Так, у творчасці Л. Галубовіча веды фарміруюцца на аснове ўяўленняў пра з’явы, падзеі, рэчы, захаваныя ў памяці яго лірычнага героя. Галоўным, вырашальным крытэрыем праўды пры спазнанні рэчаіснасці і сябе з'яўляецца ўнутрана-пачуццёвая дзейнасць персанажа, накіраваная на рэальнае пераўтварэнне свету – прыроднага і сацыяльнага: «Заснуць, каб змерці і ўзрасціць спакусна – / Жытнёвы колас, што сажнуць сярпом, / Жывое слова, што згарыць на вуснах» [6, с. 65].

Філасофская лірыка Н. Шкляравай з яе невынішчальнай прагай ідэалу, спробамі разабрацца і ў космасе быцця, і ў мікракосмасе свайго “я” з гнасеалагічнага пункта погляду таксама падаецца цікавай. Пад пяром паэтэсы ўпадабаныя раней, спецыфічныя для жаночай лірыкі, тэмы змяняюцца ўсёчалавечымі праблемамі. Уся творчасць Н. Шкляравай успрымаецца “одай” жыццю, нягледзячы на матывы болю і жаху, часам – апакаліптычнага адчування згубы: «Прамільгнуў і згас / Залаты мой час» [7, с. 27].

Падобнага кшталту мінорнасць – гэта шмат у чым вынік засваення біблейска-хрысціянскіх традыцый, якія, хоць і апасродкавана, уплываюць на творчае развіццё паэтэсы. Невыпадкова аўтарку пачынаюць прыцягваць біблейская вобразнасць і евангельскія матывы («Як з плячэй маіх крыж мой…», «Некалі царква стаяла тут…», «Святары» і інш.).

*Табліца 1.* Злёсы

| Характарыстыка | Прыём пабудовы | Прыклад |
|---|---|---|
| вершы, у якіх адбываецца гульня не з гукамі, а з сэнсамі слоў; пазнанне быцця праз побыт | Прыёмы паэтычнага сінтаксісу: анафара, паралелізм, паўторы, антытэза, эпанастрафа і інш. | У немінучых словах<br>Мікроб адкрые<br>Кубак падсунуты да сябе<br>…адкрыюся ў немінучым<br>Мной назавуцца словы…<br>Кубак адсунуты ад сябе [10, с. 33]. |

Сённяшняя беларуская філасофская лірыка ў якасці вектараў творчага пошуку абірае не толькі традыцыйную для такога віду лірыкі анталагічную, касмалагічную і гнасеалагічную праблематыку, але і засяроджваецца на навуковых праблемах, у тым ліку абіраючы ў якасці аб’екта мастацкай рэфлексіі тэкст як самастойную рэальнасць, падуладную ўласным законам.

Сярод найбольш яскравых паэтаў гэтай плыні варта згадаць імёны М. Баярына, І. Бабкова і А. Мінкіна, Г. Булыкі. Бо менавіта гэтыя аўтары працягнулі справу заходнееўрапейскай інтэлектуальнай традыцыі (творчасць Гёльдэрліна, Рыльке, Тракля, Цэлана). Так, вершы М. Баярына адметныя сэнсавай ускладненасцю, стылёвай ашчаднасцю. У сваёй паэзіі творца спрабуе пераасэнсаваць катэгорыі часу і прасторы, звяртаючыся да анірычнай рэальнасці: «Сон азначае крохкае маўчанне, / У гэты час мы людзі больш, чым рэчы. / Цяпер я заўважаю, што мой голас / На самай справе мкне да цішыні» [8, с. 58].

Вершы Г. Булыкі ўяўляюць сабой адмысловы сінтэз хіміі і паэзіі: «Да колбы корак – шліфы ўпрыцірку, / Каб дух удачы не праслізнуў, / Яшчэ спіртоўку, яшчэ прабірку, / Я сінтэзую зімой вясну» [9, с. 12]. Паэзію Г. Булыкі можна разглядаць і ў межах катэгорый эстэтыкі метарэалізму. Прыстаўка «мета-» мае ў сабе раскрыццё асноў з'явы, даследаванне яе прыроды з выхадам за межы звыклага, спасціжэнне рэчаіснасці як шматузроўневай сістэмы: «Смяюцца гарэзна слюдзінкі на плітах» [9, с. 13], «Сціскаліся каменныя кудзелі, / <…> Як душа ў каханні, маладзелі» [9, с. 14].

Нярэдка аўтары прапануюць і ўласныя мадэлі паэтычнай арганізацыі лірыкі (як фармальнай, так і зместавай), дзе даследуецца рэальнасць самога тэксту, як у вершаказах, квантэмах, злёсах А. Разанава. Так, праз прыёмы гукапісу (алітэрацыю і асананс) паэт намагаецца ў сукупнасці несупастаўляльных слоў вынайсці новыя семантычныя адценні. Пры гэтым немалаважную ролю выконваюць рытм і інтанацыя. Аб’ектам філасофска-эстэтычнай рэфлексіі некаторых жанраў-наватвораў А. Разанава, у прыватнасці вершаказаў і квантэм, якія небеспадстаўна лічацца самымі «філалагічнымі» творамі аўтара, з’яўляецца рэальнасць тэксту, праз спасціжэнне законаў якой на гукавым узроўні паэт асэнсоўвае навакольную рэчаіснасць. Падобны прынцып, але ўжо на ўзроўні лексем, праз гульню сэнсамі, назіраецца і ў новым аўтарскім жанры – злёсах:

Этымалогія гэтага тэрміна, відавочна, звязана са словам «лёс». У злёсах гук узбуйняецца да слова. І калі ў квантэмах і вершаказах асаблівая ўвага надаецца гульні з гукам, то ў разанаўскіх злёсах асноўны акцэнт пераходзіць на гульню з сэнсамі. Пры гэтым вектар творчых пошукаў А. Разанава накіраваны на адкрыццё новага, свядомае пазбяганне дублявання і самапаўтораў. Творчасць А. Разанава рэпрэзентуе новы стан паэтычнага мыслення.

Таксама мы можам гаварыць пра наяўнасць у сучаснай беларускай філасофскай паэзіі лірычнага суб’екта, які нярэдка даволі складана індэнтыфікуецца ў вершах (вершаказы і квантэмы А. Разанава). Гэта, у сваю чаргу, вымагае ўдасканалення існуючай тэрміналогіі. Суб’ектная арганізацыя лірыкі сучасных паэтаў-філосафаў падаецца даволі разнапланавай. Побач з класічнымі формамі персанажа медытатыўнай лірыкі (Я. Чыквін, Ю. Пацюпа, Л. Галубовіч, Г. Дубянецкая, В. Аксак) ва ўласна філасофскай і навуковай (А. Разанаў, У. Арлоў, І. Бабкоў і інш.) існуюць нетрадыцыйныя лірычныя суб’екты, у прыватнасці “неасінкрэтычны герой”. Часам гэта, як было заўважана вышэй, тлумачыцца station поліантычнасцю мастацкай рэальнасці паэтаў. Часам – спробай паглядзець на рэчы ў іншым ракурсе.

Трэба зазначыць, што праблема вызначэння лірычнага героя паўстала ў сувязі з творчасцю А. Разанава. У прыватнасці з яго вершаказамі, дзе суб’ект дзеяння як такі часта адсутнічае, а ў цэнтры твора знаходзяцца рэчы, дакладней – іх «гукаадлюстраванне» («Свечка», «Малако», «Нерат», «Жорны», «Аскепкі», «Муха» і інш.). Інтэрпрэтацыя падобнага кшталту вершаў вымагала альбо цалкам адмовіцца ад прынятых класіфікацый лірычных суб’ектаў, альбо шукаць новыя мадыфікацыі гэтай катэгорыі. Не дзіўна, што ў асяроддзі даследчыкаў загаварылі пра адсутнасць у вершаказах не толькі прасторава-часавых каардынат, але і лірычнага суб’екта.

Немалаважным падаецца пытанне верлібрызацыі як магістральнай тэндэнцыі фармальных пошукаў сучаснай беларускай філасофскай лірыкі. Нягледзячы на даўнюю гісторыю, свабодны верш.

ці верлібр (франц. vers libre) лічыцца малавывучанай сферай вершазнаўства. Разгледзім самыя цікавыя, на наш погляд, мадыфікацыі гэтай формы, прадстаўленыя ў сучаснай беларускай філасофскай лірыцы.

Адной з самых цікавых верлібравых мадыфікацый у творчасці А. Разанава падаецца квантэма: «хлеб назусім / аднойчы / дасца / зброя / без вобразу нябыт / прыўзнімае лёзы рунь» [10, с. 46] («хлеб назусім…»). Адсутнасць загалоўных літар і знакаў прыпынку, асацыятыўная ланцуговасць набліжаюць згаданы верш да твораў так званай плыні свядомасці. Аднак, як слушна заўважыла А. Кабаковіч, падобная тэндэнцыя – гэта імкненне «дасягнуць шматмернасці вершаванай кампазіцыі» [11, с. 168].

У творчасці У. Арлова існуюць і паэтычныя формы, якія паводле рытміка-метрычнай структуры можна індэтыфікаваць як верлібры. Часам такія вершы нагадваюць прытчы («Падарожнікі», «Жорны», «Човен» і інш.), часам – чароўна-фантастычны аповед («На беразе іншага часу»). Але і першыя, і другія цалкам адпавядаюць законам свабоднага верша: «Сярод высокай травы і красак вядзе / мяне маці за руку па поплаве. / Гэта смолкі, – паказвае яна. / А гэта – зязюльчыны слёзкі. / А вось гэта – ястрэц» [1, с. 25].

З ліку пераходных формаў Г. Дубянецкая аддае перавагу варыянтам з метрычнай арыентацыяй. Пры гэтым у паэткі сустракаюцца верлібры з асобнымі “выпадковымі” сілаба-танічнымі радкамі (часам рыфма можа быць унутранай). Такім чынам, можна гаварыць пра адсутнасць у мастацкай сістэме Г. Дубянецкай строгай мяжы паміж «чыстым» верлібрам і рознымі формамі сілаба-танічнага метра. Для свабоднага верша аўтаркі важным структураўтваральным фактарам становіцца лагічная будова выказвання (гэта характэрна, дарэчы, і для сілаба-танічнага верша). Падобная сітуацыя часам вымагае адпаведнай формы твораў: некаторыя з іх падобныя (нават візуальна) да перавернутай піраміды, дзе вяршыня (ключавое слова-змест) знаходзіцца ў канцы верлібра, а папярэднічае ёй шэраг, часта адцягненых, разважанняў: «веру ў сэнс усяісны і ў хвілях разлітую ласку / <…> асвячоную ў роспачы / Імем Тваім» [12, с. 60].

Такім чынам, сучасныя паэты-філосафы прадстаўляюць у сваёй творчасці даволі адрозныя вітальна-танатычныя канцэпцыі, сярод якіх – арыентаваная на ўсходнюю філасофію з мадыфікаваным уяўленнем пра рэінкарнацыю і ўсведамленнем наяўнасці «энтэлехіі» рэчыўнага свету (А. Разанаў, У. Арлоў); геданістычная (Л. Дранько-Майсюк); заснаваная на метафізіцы быцця (І. Бабкоў, А. Разанаў, М. Баярын). Але адметна, што большасць канцэпцый яднае перавага жыццесцвярджальнай ідэі над эсхаталагічнай, што ў пэўным сэнсе абвяргае стэрэатып пра татальную “трэнавасць” агульнага тону сённяшняй літаратуры.

Асэнсаванне феноменаў Хаосу і Космасу як другая магістральная праблема “паэзіі думкі”, што вядзецца праз разгадкі таямніц светаўладкавання, рэалізуецца праз глыбінную апеляцыю да старажытных падсвядомых асацыяцый чалавека, але не заўсёды традыцыйна. Так, Космас можа “пераймаць” функцыі Хаосу як крэатыўнага, хаця і заснаванага на парушэнні гармоніі пачатку: трактавацца як увасабленне сусветнага неспакою (Я. Чыквін); выступаць любой з праяваў матэрыяльнага існавання, у адрозненне ад духоўнага, боскага, касмічнага (В. Аксак); выступаць адным з відаў прыгажосці (Ю. Пацюпа) і інш.

Гнасеалагічныя матывы ў сучасных паэтаў-філосафаў выяўляюцца ў двух накірунках: спазнанне трансцэндэнтнага праз іманентнае (Л. Галубовіч, Л. Дранько-Майсюк, Н. Шклярава і інш.) і наадварот (А. Мінкін, У. Арлоў). Адметную мадэль спасціжэння рэчаіснасці, дзе аднолькава важнымі становяцца абодва вектары прадстаўляе А. Разанаў. Але важна адзначыць, што сутнаснае раскрыццё чалавечага існавання заўсёды ляжыць у аснове мастацкага пошуку творцаў. Якія б філасофскія катэгорыі яны не асэнсоўвалі, беларуская “паэзія думкі” застаецца антрапацэнтрычнай.

Навуковая паэзія прадстаўлена ў сённяшнім мастацтве слова не так шырока. Найбольш паслядоўнае яе ўвасабленне звязваецца з імёнамі Г. Булыка і А. Разанава. Крэатыўны пачатак першай выяўляецца ў міждысцыплінарнай варыяцыі, спалучэнні лірыкі з хіміяй, фізікай, матэматыкай, бо філасофскі склад аўтарскага мыслення мае ў сваёй аснове барацьбу паэта і навукоўка, што ўплывае і на вобразна-выяўленчую сістэму і стыль вершаў і вядзе ўскладнення семантычнага поля твора. Мастацкі дослед А. Разанава ў многіх яго арыгінальных жанрах (вершаказах, квантэмах, злёсах) вядзецца ў сферы рэальнасці тэксту. І калі ў вершаказах і квантэмах у якасці самастойнага элементу выступае гук, то ў злёсах пошукі заканамернасцей у моўнай сферы вядуцца шляхам звароту да такой адзінкі, як слова, праз прыём гульні з сэнсам якога спасцігаецца быццё.

Не менш выразна праявіліся ў сённяшніх паэтаў і навацыі ў галіне паэтыкі. Найперш тут трэба канстатаваць наяўнасць тэндэнцыі да скажэння прасторава-часавага кантынууму вершаў, у сувязі з чым можна гаварыць пра паняцце мультыверсуму – прысутнасці некалькіх раўнапраўных рэальнас-

цей. Гэта можа быць анейрасфера, патубаковы свет, прастора кахання, рэчыўны свет і інш. (І. Бабкоў, А. Разанаў, У. Арлоў, Л. Дранько-Майсюк, Г. Дубянецкая і інш.). Пры гэтым мастацкая прастора, як правіла, характарызуецца транзітыўнасцю. Сродкі-медыумы, аднак, у гэтым выпадку пераважна традыцыйныя: акно, дзверы, люстэрка, студня і г. д.

Герой у такіх умовах надзяляецца звышчалавечымі якасцямі і часцей атаясамлівае з «фальшрэальнасцю» навакольную рэчаіснасць. Нярэдка лірычны суб'ект даволі складана ідэнтыфікуецца ў вершах (вершаказы і квантэмы А. Разанава) або набывае выгляд так званага неасінкрэтычнага героя (паэзія У. Арлова, І. Бабкова, версэты А. Разанава і інш.).

Відавочна, што верлібрызацыя з'яўляецца адной з магістральных тэндэнцый развіцця сучаснай філасофскай паэзіі. Гэта пацвярджаецца не толькі наяўнасцю ў ёй шматлікай колькасці свабодных вершаў, але і стварэннем некаторымі пісьменнікамі (А. Разанавым, У. Арловым) арыгінальных адверлібравых форм, засвоеных іншымі сучаснымі творцамі інтэлектуальна-філасофскага кірунку.

Сказанае вышэй дазваляе гаварыць, што сённяшняя беларуская філасофская лірыка валодае комплексам спецыфічных адметнасцей, а таму ўяўляе сабой самабытную мастацкую сістэму.

**Літаратура**


1. *Арлоў, У.* Паром праз Ля-Манш // Мн. : Логвінаў, 2006. – 157 с.
2. *Разанаў, А.* Танец з вужакамі // Мн. : Маст. літ, 1999. – 462 с.
3. *Дранько-Майсюк, Л.* Паэтаграфічны раман // Мн. : Кніга, 2002. – 111 с.
4. *Аксак, В.* Капліца // Мн. : Маст. літ, 1994. – 111с.
5. *Чыквін, Я.* Адно жыццё // Беласток : Бібліятэка Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа", 2009. – 303 с.
6. *Галубовіч Л.* Заложнік цемры // Мн. : Маст. літ., 1994. – 142 с.
7. *Шклярава Н.* Аканіцы // Мн. : Беларуская навука, 2007. – 192 с.
8. *Баярын, М.* Шалёны вертаградар // Мн. : БГАЦК, 1998. – 88 с.
9. *Булыка, Г.* Сінтэз // Мн. : Маст. літ., 1986. – 86 с.
10. *Разанаў А.* І потым нанава пачаць: квантэмы, злёсы, вершы // Мн. : Логвінаў, 2011. – 102 с.
11. *Кабаковіч, А.* Беларускі свабодны верш // Мн. : Навука і тэхніка, 1984. – 176 с.
12. *Дубянецкая, Г.* Анадыямэна // Мн. : Медисонт, 2008. – 96 с.